Журнал Белорусского государственного университета. История. 2017. № 4. С. 108–114
Journal of the Belarusian State University. History. 2017. No. 4. P. 108–114

*УДК (930.253:347:6):271/272*

# СПРАВАВОДСТВА ПА СКАСАВАННІ ШЛЮБУ Ў ПРАВАСЛАЎНЫХ І РЫМСКА-КАТАЛІЦКІХ КАНСІСТОРЫЯХ (канец XVIII – пачатак XX ст.)

***З. В. АНТАНОВІЧ***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Праводзіцца кампаратыўны аналіз тэрміналогіі, арганізацыі і дакументавання судовай дзейнасці праваслаўных і рымска-каталіцкіх кансісторый на беларускіх землях у канцы XVIII – пачатку XX ст. Вызначаюцца тры віды разрыву сямейных адносін – прызнанне шлюбу незаконным, дазвол на асобнае пражыванне мужа і жонкі, развод. Абгрунтоўваюцца прычыны звароту ў кансісторыі. Вылучаюцца два найбольш істотныя перыяды ў арганізацыі справаводства кансісторый па справах аб скасаванні шлюбу і яго нарматыўным рэгуляванні для праваслаўнай і рымска-каталіцкай цэркваў: канец XVIII ст. – 1841 г.; 1840-я гг. – пачатак XX ст. Адзначана, што для праваслаўнай царквы можна акрэсліць трэці перыяд: канец XIX – пачатак XX ст. Сцвярджаецца, што непасрэдна судовы працэс уключаў тры этапы – прыняцце кансісторыяй прашэння да разгляду, следства, прыняцце рашэння, – а пэўнай міжканфесіянальнай уніфікацыі судаводства ўдалося дасягнуць толькі з прыняццем Статута духоўных кансісторый (1841). Паказана, што з гэтага часу спецыфіка канфесій захоўвалася ў афармленні судовай дакументацыі, выкарыстанні асобных відаў дакументаў, арганізацыі прыняцця да разгляду зваротаў насельніцтва і вынясення прысудаў кансісторыямі па іх, а таксама ў формах падачы апеляцый.

***Ключавыя словы:*** справаводства кансісторыі; праваслаўная кансісторыя; рымска-каталіцкая кансісторыя; судовая дакументацыя кансісторыі; справы аб скасаванні шлюбу.

# ДЕЛОПРОИЗВОДСТВО ПО РАСТОРЖЕНИЮ БРАКА В ПРАВОСЛАВНЫХ И РИМСКО-КАТОЛИЧЕСКИХ КОНСИСТОРИЯХ (конец XVIII – начало XX в.)

***З. В. АНТОНОВИЧ***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Проводится компаративный анализ терминологии, организации и документирования судебной деятельности православных и римско-католических консисторий на белорусских землях в конце XVIII – начале XX в. Определяются три вида разрыва семейных отношений – признание брака незаконным, разрешение отдельного проживания мужа и жены, развод. Обосновываются причины обращений в консистории. Выделяются два наиболее значимых периода в организации судопроизводства консисторий по бракоразводным делам и его нормативном регулировании для православной и римско-католической церквей: конец XVIII в. – 1841 г.; 1840-е гг. – начало XX в. Отмечено, что для православной церкви можно определить третий период: конец XIX – начало XX в. Показано, что непосредственно судебный процесс включал три этапа – принятие консисторией прошения к рассмотрению, следствие, принятие решения, – а некоторой межконфессиональной унификации судопроизводства удалось достичь только с принятием Устава духовных консисторий (1841). Утверждается, что с указанного времени специфика конфессий сохранялась

**Образец цитирования:**
Антановіч З. В. Справаводства па скасаванні шлюбу ў праваслаўных і рымска-каталіцкіх кансісторыях (канец XVIII – пачатак XX ст.) // Часоп. Беларус. дзярж. ун-та. Гісторыя. 2017. № 4. С. 108–114.

**For citation:**
Antonovich Z. V. Record management on the dissolution of marriage in the Orthodox and Roman Catholic consistories (late XVIII – early XX century). *J. Belarus. State Univ. Hist.* 2017. No. 4. P. 108–114 (in Belarus.).

**Автор:**
***Зинаида Васильевна Антонович*** – кандидат исторических наук, доцент; доцент кафедры источниковедения исторического факультета.

**Author:**
***Zinaida V. Antonovich***, PhD (history), docent; associate professor at the department of source study, faculty of history.
*zinantonowicz@gmail.com*

в оформлении судебной документации, использовании отдельных видов документов, организации принятия к рассмотрению обращений населения и вынесения решений консисториями по ним, а также в способах их опротестования.

***Ключевые слова:*** делопроизводство консистории; православная консистория; римско-католическая консистория; судебная документация консистории; бракоразводные дела.

# RECORD MANAGEMENT ON THE DISSOLUTION OF MARRIAGE IN THE ORTHODOX AND ROMAN CATHOLIC CONSISTORIES (late XVIII – early XX century)

***Z. V. ANTONOVICH*** [a]

[a] *Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

The article provides a comparative analysis of the terminology, organization and documentation of judicial activities of Orthodox and Roman Catholic consistories in Belarus in the late XVIII and early XX centuries. The author defines and justifies three types of family breaks (recognition of marriage as illegal, permission for separate residence of a husband and wife, divorce), and the reasons for private appeals to Consistories. In accordance with the organization of proceedings of the Orthodox and Roman Catholic Consistories for divorce cases and its regulation, two most significant periods are identified: late XVIII – 1841; since 1840s to the early XX centuty. The third period (late XIX – early XX century) is identified for Orthodox church. The trial involved three stages, and some unification of the judiciary between confessions was achieved after 1841. The specifics of the confessions persisted in the design of judicial documentation, the use of certain types of documents, the organization of the adoption of appeals by the population and the decision by the Consistory for them, and their appeal.

***Key words:*** consistory' records management; Orthodox Consistory; Roman Catholic Consistory; judicial documentation of Consistory; divorce files.

## Уводзіны

Рэлігійныя догмы адыгрывалі значную ролю ў фарміраванні светапогляду і маральных норм чалавека XIX ст. На беларускіх землях з хрысціянскіх веравызнанняў найбольш распаўсюджанымі былі праваслаўе і каталіцтва, якія мелі іерархізаваную структуру на чале з епіскапамі, біскупамі, арцыбіскупамі. Органамі адміністрацыйна-тэрытарыяльнага кіраўніцтва і духоўнага суда ў праваслаўных епархіях і рымска-каталіцкіх дыяцэзіях з'яўляліся кансісторыі, сярод матэрыялаў дзейнасці якіх захавалася значная частка судовай дакументацыі, у тым ліку звязанай з разрывам сямейных адносін. Нягледзячы на агульныя рысы нарматыўнага рэгулявання дзейнасці згаданых канфесій, тэрміналагічныя і справаводныя аспекты скасавання шлюбу ў праваслаўных і рымска-каталіцкіх кансісторыях мелі спецыфіку, якая дагэтуль не выступала ў якасці аб'екта даследавання. У навуковых працах гэта праблематыка закранаецца павярхоўна [1–3; 4, с. 132–145; 5–8]. З улікам захаванасці дакументаў крыніцавай базай дадзенага даследавання выступаюць матэрыялы архіўных фондаў «Мінская духоўная кансісторыя», «Магілёўская духоўная кансісторыя», «Магілёўская рымска-каталіцкая кансісторыя», якія захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі[1]. Дзейнасць адпаведных устаноў-фондаўтваральнікаў распаўсюджвалася на пераважную частку Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX ст., а Магілёўская кансісторыя стала правапераемніцай матэрыялаў Мінскай кансісторыі пасля ўваходжання тэрыторыі Мінскай губерні ў склад архідыяцэзіі [4, с. 23–24].

## Асноўная частка

Вылучаюцца тры віды разрыву сямейных адносін, якія выкарыстоўваліся праваслаўнай царквой у канцы XVIII – пачатку XX ст.: прызнанне шлюбу незаконным (па прычынах непаўналецця аднаго з сужэнцаў, чацвёртага шлюбу, кровазмяшэння, бігаміі), скасаванне шлюбу (праз распусту сужэнца, яго працяглую адсутнасць, фізічны гвалт і інш.) і асобнае пражыванне мужа і жонкі (пераважна праз фізічны гвалт). У рымска-каталіцкай царкве з канца XVIII ст. замацоўваліся два тэрміны: сепарацыя (*separatio*) і скасаванне шлюбу (*nullitae matimonii*). Пад сепарацыяй разумелася замацаванне

[1] Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 136, 1781, 2301.

асобнага пражывання мужа і жонкі без абвяшчэння юрыдычнай несапраўднасці іх сямейнага стану[1]. У такім выпадку сужэнцы не мелі права ўступаць у новы шлюб. Непасрэдна скасаванне шлюбу характарызавала завершаны акт, якім мужу і жонцы давалася поўная свабода далейшага самавызначэння[2]. Рымска-каталіцкія кансісторыі маглі прызнаць шлюб незаконным у выпадках, аналагічных тым, якія ўлічваліся праваслаўнай царквой, для адзначэння чаго часам выкарыстоўваўся тэрмін «дыспенсацыя» (*dispensatio*)[3]. Паводле заканадаўства Расійскай імперыі не лічыўся паўнамоцным шлюб праваслаўнай асобы з каталіком, калі абрад праводзіў каталіцкі святар[4]. Рымска-каталіцкімі кансісторыямі значна часцей, чым праваслаўнымі, разглядаліся справы аб недзеяздольнасці мужа або жонкі, што даказвалася паказаннямі сведак і медыцынскімі пасведчаннямі [6][5]. Справы аб разрыве сямейных адносін, незалежна ад іх віду, мелі аналагічны склад дакументаў, што было абумоўлена паслядоўнасцю судаводства, прычым скасаванне шлюбу часта суправаджалася раздзельным пражываннем сужэнцаў падчас працэсу.

Рэгуляванне разгляду спраў аб скасаванні шлюбу ажыццяўлялася як на падставе нарматыўных актаў канфесійнага кіраўніцтва, так і з апірышчам на заканадаўства Расійскай імперыі. У праваслаўнай царкве выкарыстоўваліся каноны, замацаваныя ў Кормчай кнізе, правілах Святога Васілія і святых апосталаў. Пры вынясенні прысуду абапіраліся таксама на прэцэдэнты, апублікаваныя ў Поўным зборы законаў Расійскай імперыі ўказы Сінода[6]. Рымска-каталіцкая царква карысталася шэрагам пераважна ратыфікаваных органамі дзяржаўнай улады кананічных актаў і агульнадзяржаўным заканадаўствам[7]. З 1841 г. асноўным дакументам для абедзвюх канфесій з’яўляўся Статут духоўных кансісторый у рэдакцыях 1841 і 1883 гг.[8] Справаводства праваслаўных кансісторый вялося на рускай мове, а рымска-каталіцкіх – на польскай з перакладам іншамоўных тэкстаў на рускую мову, за выключэннем перапіскі з дзяржаўнымі ўстановамі, якая, згодна з указам Рымска-каталіцкай духоўнай калегіі 1846 г., вялася па-руску[9]. Лацінамоўная тэрміналогія выкарыстоўвалася выключна ва ўнутраных дакументах.

Справы аб скасаванні шлюбаў разглядаліся ў кансісторыях і ініцыіраваліся прашэннямі прыватных асоб (першы этап разгляду справы). Праваслаўная царква з прычыны яе дамінавання на грамадска-палітычнай арэне Расійскай імперыі мела пашыраныя паўнамоцтвы ў дачыненні да насельніцтва: калі адзін з сужэнцаў быў праваслаўным, справа перадавалася ў праваслаўную духоўную кансісторыю[10]. Аналагічным чынам вырашалася сітуацыя, калі чалавек змяняў веравызнаўчую прыналежнасць на праваслаўе, нават калі шлюб заключаўся святаром іншай канфесіі. Напрыклад, справа аб законнасці шлюбу Яна Бернарда Кавалеўскага, субдыякана троцкага (пазней – мінскага) дамініканскага кляштара, з Францішкай Галоўня ў сувязі з іх пераходам у праваслаўнае веравызнанне была перададзена на разгляд Мінскай праваслаўнай кансісторыі[11]. У першай палове XIX ст. ваеннаслужачыя і сяляне павінны былі атрымліваць дазвол на зварот у кансісторыю ад вайсковага кіраўніцтва або ўладальнікаў адпаведна. Пры гэтым прашэнні прымаліся згодна з адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам цэркваў і месцам жыхарства мужа і жонкі. У падобных выпадках рымска-каталіцкія кансісторыі карысталіся Інструкцыяй аб парадку разгляду спраў скасавання шлюбу, што забяспечвала аптымальныя ўмовы для прыняцця рашэння[12].

Прашэнні афармляліся па вызначанай для грамадзянскага судаводства форме, якая неаднаразова змянялася і была замацавана ў Зводзе законаў Расійскай імперыі[13]. Структура прашэння ўключала звесткі пра істца, выклад абставін справы, часам з падзеламі на пункты, і канстатацыю неабходнасці скасаваць шлюб. У рымска-каталіцкіх кансісторыях гэтыя дакументы часта перакладаліся на рускую мову. Выкарыстанне гербавай паперы істцамі было абавязковым, як і аплата выдаткаў кансісторыі за разгляд справы.

Прычынамі звароту ў кансісторыі выступалі пераважна невядомае месцазнаходжанне мужа (акрамя рэкрутаў) або жонкі на працягу пяці гадоў,

[1] *Горбачевский Н. В.* Separatio // Словарь древнего актового языка Северо-Западного края и царства Польского. Вильно, 1874. С. 329–330.
[2] *Горелов А., Масленникова Г., Сахаров П.* Брак // Католическая энциклопедия : в 2 т. М., 2005. Т. 1. С. 731.
[3] Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 1781. Воп. 3. Спр. 19; Воп. 24. Спр. 4, 6, 1361, 4388.
[4] Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 1781. Воп. 21. Спр. 73.
[5] Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 1781. Воп. 24. Спр. 34. Спр. 65. Арк. 9–16.
[6] Полное собрание законов Российской империи с 1649 г. Собрание первое : в 45 т. СПб., 1830–1851. Т. 28. 1830. Ст. 21585.
[7] *Карлов Ю.* Дипломатические контакты России со святым Престолом // Католическая энциклопедия : в 2 т. М., 2005. Т. 1. С. 1644–1649; *Філатава А. М.* Суд царкоўны // Рэлігія і царква на Беларусі : энцыкл. давед. Мінск, 2001. С. 313–314.
[8] Устав духовных консисторий. СПб. : Синодальная типография, 1843 (2-е изд., 1883).
[9] Lietuvos valstybės istorijos archyvas. F. 604. Ap. 4. B. 524.
[10] Полное собрание законов Российской империи с 1649 г. Собрание первое : в 45 т. СПб., 1830–1851. Т. 25. 1830. Ст. 18517.
[11] Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 6159. Арк. 1–6.
[12] Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 1781. Воп. 3. Спр. 2. Арк. 440–441.
[13] Свод законов гражданских // Свод законов Российской империи повелением государя императора Николая Павловича составленный. СПб., 1835. Т. X. Ст. 1670–1681.

пацверджаная нявернасць, пакаранне з пазбаўленнем правоў стану, рэдка – немагчымасць фізічнага сужыцця (не раней чым праз тры гады шлюбу), непаўналецце аднаго з сужэнцаў. Праваслаўная царква передавала на разгляд свецкіх дзяржаўных установ справы па скасаванні шлюбу ў сувязі з псіхічным станам сужэнца, кровазмяшэннем і бігаміяй, вянчаннем раскольнікаў. Рымска-каталіцкія кансісторыі ў якасці аргументаў пры разглядзе спраў таксама прымалі да ўвагі фізічнае або псіхалагічнае прымушэнне да шлюбу, публічную нядобрапрыстойнасць сувязі, а ў рэдкіх выпадках – палітычныя рознагалоссі сужэнцаў. Жанчыны часцей звярталіся ў кансісторыі, даказваючы сваё ўступленне ў шлюб пад прымусам з боку бацькоў[1]. Напыклад, гэта было адным з аргументаў у прашэнні Дамінікі Крэсевіч[2]. У 1833 г. у Мінскую рымска-каталіцкую кансісторыю звярнулася Ідалія Солтан з Пацеяў, каб скасаваць шлюб з палкоўнікам польскіх войск Адамам Солтанам у сувязі з яго высылкай за межы Расійскай імперыі з забаронай звароту і «палітычнай смерцю» праз удзел у паўстанні[3]. Сялянка в. Віцкаўшчызна Пелагея Лойкава прасіла аб скасаванні шлюбу з прычыны высылкі мужа ў Сібір за забойства дзядзькі[4]. Ісцец мог звярнуцца асабіста або праз блізкіх сваякоў, памешчыка (у выпадку сялян), але не праз прадстаўніка духавенства, гэта адносілася нават да непісьменных асоб[5]. Напрыклад, у 1824 г. Іван Берэндэс, бацька Ганны Дзянісавай, звярнуўся ў Мінскую праваслаўную кансісторыю з мэтай скасавання шлюбу дачкі, таму што яе муж Дыянізій злоўжываў спіртнымі напоямі і крыўдзіў яе, чым прымусіў збегчы да бацькі[6]. У 1838 г. памешчык Рышард Абуховіч звяртаўся ў тую ж кансісторыю за селяніна Трафіма Антонава, жонка якога пакінула мужа ў 1813 г. Пры гэтым кансісторыя патрабавала даведку аб згодзе селяніна на пададзены зварот[7]. Рашэнне аб прыняцці звароту да разгляду ў праваслаўнай царкве занатоўвалася на адвароце прашэння ў выглядзе выпісу з журнала пасяджэння прысутнасці кансісторыі, а ў каталіцкай традыцыі далучаўся чарнавік журнала або на ініцыятыўным дакуменце пазначалася рэзалюцыя біскупа.

Другі этап разгляду спраў аб скасаванні шлюбу ўключаў збор звестак і правядзенне апытанняў сведак. Кансісторыі абедзвюх канфесій з мэтай удакладнення асобных пытанняў актыўна выкарыстоўвалі перапіску (адносіны і паведамленні). Адказчык таксама дасылаў у кансісторыю свае меркаванні па пунктах абвінавачвання ў выглядзе спецыяльнага дакумента – данясення ў праваслаўі і тлумачэння (паяснення)[8] у каталіцтве, якія афармляліся аналагічна прашэнням. У выпадку звароту па прычыне працяглай адсутнасці сужэнца ў кансісторыю падаваліся дадатковыя дакументы: выпіс з метрычнай кнігі аб шлюбе і, калі сведкі не маглі з'явіцца асабіста ў кансісторыю, водгукі з пазначэннем ступені сваяцтва з асобай, якая знікла, і яе верагоднага месцазнаходжання. Напрыклад, у пошуках Агаф'і Сарокінай у 1909 г. водгукі накіравалі яе бацька Сямён Мікіфараў і браты Сямён і Стэфан Агеевы, сёстры Ірына і Феадосія, а таксама муж апошняй Іван Кавалёў[9].

Непасрэдна следчыя мерапрыемствы праваслаўныя кансісторыі, у адрозненне ад рымска-каталіцкіх, першапачаткова ўскладалі на мясцовыя органы ўлады, як, напрыклад, у справе Трафіма Антонава[10]. Рымска-каталіцкія кансісторыі фарміравалі камісіі з духоўных асоб – членаў кансісторыі, якія не мелі блізкіх сувязей з пачынальнікамі працэсу, у складзе старшыні і двух або чатырох суддзяў. Напрыклад, у камісію Магілёўскай рымска-каталіцкай кансісторыі па скасаванні шлюбу Ганны і Юзафа Сліжаноўскіх увайшлі Казімір Шышка, Войцех Улаховіч, Ігнацій Шукевіч ад кансісторыі, а з боку адказчыка былі дэлегаваны камісар, смаленскі канонік, чарэйскі пробашч Геранім Гарабурда[11]. Акрамя таго, скасаванне шлюбу ў рымска-каталіцкай царкве не магло быць прызнана без прысутнасці дэфенсара, асноўным абавязкам якога з'яўлялася абарона шлюбу праз дыскрэдытацыю аргументаў істца. У 1859 г. азначаную пасаду ў Магілёўскай архідыяцэзіі займаў Францыск Дабравольскі, магістр тэалогіі і капелан Магілёўскай гімназіі[12], а ў канцы XIX ст. дзейнічалі тры дэфенсары – Караль Грынявіцкі, Ян Арцымовіч і Людовік Славінскі[13]. Праца камісіі пачыналася з пісьмовай перадачы паўнамоцтваў бакамі асобам, якія пры неабходна-

[1] Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 1781. Воп. 3. Спр. 2–5, 8, 17.
[2] Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 826. Арк. 5.
[3] Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 1781. Воп. 3. Спр. 57. Арк. 9–9 адв., 157–157 адв.
[4] Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 15764. Арк. 1–2.
[5] Полное собрание законов Российской империи с 1649 г. Собрание первое : в 45 т. СПб., 1830–1851. Т. 18. 1830. Ст. 12935.
[6] Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 6533. Арк. 1–1 адв.
[7] Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 13225. Арк. 1, 4–8.
[8] Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 1781. Воп. 3. Спр. 8. Арк. 4–7.
[9] Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 2301. Воп. 1. Спр. 148. Арк. 16–19.
[10] Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 13225. Арк. 10–12.
[11] Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 1781. Воп. 3. Спр. 2. Арк. 52.
[12] Ordo totius divini officii persolvendi pro anno reparatae salutis MDCCCLVIII secundum post bissextilem in commodum cleri archidioeceseos Mohiloviensis. Vilnae, 1859. S. 88.
[13] Ordo divini officii et missarum pro archidioecesi Mohiloviensi. Petropolis, 1882. S. 142–145.

Журнал Белорусского государственного университета. История. 2017. № 4. С. 108–114
Journal of the Belarusian State University. History. 2017. No. 4. P. 108–114

сці прадстаўлялі мужа і жонку падчас следства і судовых пасяджэнняў, што афармлялася спецыяльным відам дакумента – пленіпатэнцыяй[1]. Пры гэтым сужэнцы не павінны былі падрабязна абгрунтоўваць сваю адсутнасць.

Праваслаўныя і каталіцкія следчыя камісіі ажыццяўлялі падрыхтоўку і правядзенне допытаў. Спісы сведак складаліся на падставе пададзенай істцом і адказчыкам інфармацыі, а пытанні накіроўваліся на высвятленне абставін справы[2]. Напрыклад, у працэсе па скасаванні шлюбу паміж Юзафам і Петранэляй Пятровічамі было сфармулявана па тры пытанні ад кожнага сужэнца, прычым блізкіх па сутнасці[3]. Сведкі падпісвалі «клятвеннае абяцанне» – прысягу ў даставернасці звестак, складзеную з улікам іх веравызнаўчай прыналежнасці. Калі выкліканыя асобы не з'яўляліся, пасяджэнне магло пераносіцца на іншы дзень, гэта залежала ад значнасці інфармацыі, якой яны валодалі. Сведчанні мелі выключнае значэнне пры доказе нявернасці, таму што самастойнае прызнанне сужэнцаў з 1811 г. не лічылася аргументам[4]. Так адбылося пры разглядзе справы Мацвея і Кацярыны Трыбухіных[5]. Па выніках кожнага пасяджэння складаўся асобны пратакол, у структуру якога ўваходзілі стандартная фармулёўка, дата і апісанне сутнасці разгледжанага пытання ў нарратыўнай форме. Завяршалася пасяджэнне каталіцкіх камісій прыняццем пастановы, юрыдычная вартасць якой замацоўвалася подпісамі членаў гэтых камісій. У праваслаўнай традыцыі па аналогіі з пратаколам допыту афармляліся сшыткі духоўнай кансісторыі на гербавай паперы за подпісамі членаў камісіі, дзе таксама адзначаліся адказы на кожнае пытанне па спісе[6].

У другой палове XIX ст. у выніку ўніфікацыі справаводства праваслаўнай царквы і іншаслаўных веравызнанняў сведкі выклікаліся непасрэдна ў кансісторыю адпаведнымі відамі дакументаў – павесткамі або публікацыямі, якія дастаўляліся праз мясцовыя органы ўлады пад падпіску сведак аб атрыманні. Кожнае дзеянне прысутнасці кансісторыі па справе пратакаліравалася ў журналах пасяджэнняў, а прынятае рашэнне з'яўлялася абавязковым для выканання. Праваслаўнымі кансісторыямі замест сшыткаў у вызначаны перыяд афармляліся «апытальныя пункты», у якія ўносіліся агульныя пытанні (узрост, знаёмства з сям'ёй, час пражывання ў мясцовасці і г. д.) і спецыяльна сфармуляваныя пытанні ў залежнасці ад сутнасці справы (ці з'яўляўся сведкам нявернасці і г. д.)[7]. У пачатку XX ст. да справы далучаліся судовыя прамовы – кароткія выступленні мужа і жонкі па сутнасці разбіральніцтва, як, напрыклад у справе дваран Сігізмунда і Елізаветы Вітольд-Александровічаў[8].

Апошнім этапам разгляду справы аб скасаванні шлюбу было вынясенне прысуду. Праваслаўнымі кансісторыямі па выніках разгляду справы рыхтаваўся праект указа з рашэннем, які накіроўваўся епіскапу на азнаямленне і зацвярджэнне, а праз яго – у Сінод[9]. У 1832 г. ажыццяўлялася аптымізацыя справаводства духоўнага ведамства: епіскапы атрымалі правы прымаць канчатковае рашэнне па справах аб скасаванні шлюбу сярод сялян і мяшчан, а з 1834 г. – сярод жыхароў ваенных пасяленняў[10]. Пасля адпаведнай рэзалюцыі бакі знаёміліся з указам пад роспіс і мелі права звярнуцца з апеляцыяй у Сінод на працягу двух месяцаў. Аналагічнай інстанцыяй у дачыненні да рашэнняў Магілёўскай рымска-каталіцкай кансісторыі пасля арцыбіскупа з'яўляўся Сенат[11], а з 1798 г. апеляцыі Мінскай рымска-каталіцкай кансісторыі прымаліся, згодна з падпарадкаваннем, у Магілёўскай рымска-каталіцкай кансісторыі. Рашэнні апошняй аспрэчваліся біскупам іншай дыяцэзіі ў межах Расійскай імперыі, прызначаным Папам Рымскім[12]. Невінаватаму боку выдавалася пасведчанне аб скасаванні шлюбу, у якім адзначалася, што ён вызвалены на законных падставах ад шлюбу з правам уступлення ў новы саюз. Вінаватаму боку прызначалася епітым'я і ў пераважнай большасці выпадкаў (да 1904 г.) – забарона ўступаць у новы шлюб да канца жыцця, як, напрыклад, у дачыненні да Акіліны Міньковай[13] [7].

У рымска-каталіцкай царкве да 1840-х гг. падвядзенне вынікаў разгляду справы афармлялася на аснове тэзісаў прашэння і кароткіх вытрымак з пратаколаў пасяджэнняў. Ва ўступе адзначаліся аргументы істца і адказчыка. Асноўная частка дакумента падзялялася на пункты (у адпаведнасці

[1] Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 1781. Воп. 3. Спр. 8. Арк. 270–271.
[2] Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 13225. Арк. 10–12.
[3] Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 1781. Воп. 3. Спр. 17. Арк. 14.
[4] Полное собрание законов Российской империи с 1649 г. Собрание первое : в 45 т. СПб., 1830–1851. Т. 31. 1830. Ст. 20693.
[5] Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 42131. Арк. 1–2.
[6] Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 21773. Арк. 30–37.
[7] Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 2301. Воп. 1. Спр. 780. Арк. 29–30.
[8] Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 2301. Воп. 1. Спр. 780. Арк. 16–16 адв.
[9] Полное собрание законов Российской империи с 1649 г. Собрание первое : в 45 т. СПб., 1830–1851. Т. 7. 1830. Ст. 4190.
[10] Полное собрание законов Российской империи. Собрание второе : в 55 т. СПб., 1830–1884. Т. 7. 1833. Ст. 5585; Т. 9. 1835. Ст. 5585; Т. 9. 1835. Ст. 6845.
[11] Полное собрание законов Российской империи с 1649 г. Собрание первое : в 45 т. СПб., 1830–1851. Т. 21. 1830. Ст. 15876.
[12] Свод законов Российской империи. СПб., 1896. С. 1181.
[13] Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 2301. Воп. 1. Спр. 1098. Арк. 1–1 адв.

з колькасцю пасяджэнняў), прычым маглі прыводзіцца звесткі і кароткія цытаты са сведчанняў. Пратакол завяршаўся прапановай прысуду, якая магла быць прадстаўлена асобным відам дакумента – рашэннем. З сярэдзіны XIX ст. сутнасць справы перадавалася сцісла, пераважна без цытавання. Матэрыялы разгляду справы прадстаўляліся на разгляд біскупа, які выдаваў указ або накіроўваў яе на дадатковае следства, калі лічыў прысуд недастаткова аргументаваным. Члены кансісторый мелі права на аргументацыю так званага асобага меркавання ў выпадку нязгоды з агульным рашэннем. У выніковым указе адзначаліся асноўныя аргументы для абгрунтавання прынятага рашэння. Дакументы судовых працэсаў аб скасаванні шлюбу фарміраваліся ў асобныя справы ў адпаведнасці з прозвішчамі істца і адказчыка з пранумараванымі аркушамі.

## Высновы

Такім чынам, на беларускіх землях у канцы XVIII – пачатку XX ст. праваслаўнымі і рымска-каталіцкімі кансісторыямі разглядаліся пытанні разрыву сямейных адносін у межах кампетэнцый духоўнага суда. Па вызначэнні грамадзянска-прававога статусу сужэнцаў па выніках разгляду гэтыя справы, нягледзячы на спецыфіку тэрміналогіі ў кансісторыях розных канфесій, падзяляліся на тры віды: прызнанне сувязі незаконнай, асобнае пражыванне мужа і жонкі (сепарацыя) і скасаванне шлюбу з магчымасцю ўступлення ў паўторны саюз. Даследаванне спраў аб разрыве шлюбу дазваляе выявіць шэраг агульных рыс нарматыўнага рэгулявання і дакументацыйнага забеспячэння ў праваслаўнай і каталіцкай цэрквах.

У фарміраванні справаводства па скасаванні шлюбу і яго нарматыўным рэгуляванні вылучаюцца два найбольш значныя перыяды: падрыхтоўка ўніфікацыі дзяржаўнага і канфесійнага судаводства з актыўным прыцягненнем мясцовых органаў улады да разгляду спраў у праваслаўнай царкве і стварэннем выязных камісій у складзе каталіцкага духавенства (канец XVIII ст. – 1841 г.); разгляд спраў аб скасаванні шлюбу на падставе Статута духоўных кансісторый у органах духоўнага суда абедзвюх канфесій (1840-я гг. – пачатак XX ст.). Для праваслаўнай царквы вылучаецца трэці этап, звязаны з імкненнем да спрашчэння справаводства і працэсу прыняцця рашэнняў (канец XIX – пачатак XX ст.). Кансісторыі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. пры прыняцці рашэнняў пераважна карысталіся агульнадзяржаўнымі актамі, прысуды праваслаўнаму насельніцтву выносіліся на падставе ўнутрыканфесійных дакументаў (Кормчая кніга, правілы Святога Васілія і святых апосталаў, кананічныя акты), а каталіцкаму – ратыфікаваных вышэйстаячымі органамі дзяржаўнай улады нарматыўных актаў. Дакументацыя праваслаўнай царквы складалася на рускай мове, а рымска-каталіцкай – пераважна на польскай (часам – лацінскай) з перакладам найбольш істотных дакументаў на рускую мову.

У судаводстве адпаведных канфесій па справах аб скасаванні шлюбу вылучаюцца тры этапы. Пры прыняцці прашэння (першы этап) вызначалася магчымасць разгляду справы ў кансісторыі. Пры гэтым звярталася ўвага на афармленне ініцыятыўнага дакумента (прашэння) у адпаведнасці з нарматыўнымі патрабаваннямі і прыналежнасць істца да пэўнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі царквы. Следства (другі этап) уключала ў сябе збор звестак шляхам перапіскі з органамі дзяржаўнай і мясцовай улады, прадстаўнікамі духавенства, адказчыкам і апытанне сведак. Апошняе адбывалася падчас пасяджэння камісій, што ажыццяўлялі допыты сведак (пасля прывядзення іх да прысягі і ў прысутнасці кансісторыі) па пераліку пытанняў. На пасяджэннях рымска-каталіцкіх камісій і кансісторый па справах аб скасаванні шлюбу абавязковай была прысутнасць дэфенсара. Вынікі працы камісій афармляліся дакументамі падобнай структуры – сшыткамі ў праваслаўнай царкве і пратаколамі ў каталіцкай. З 1840-х гг. правядзенне ўсіх следчых мерапрыемстваў адбывалася ў прысутнасці кансісторый, дзейнасць якіх фіксавалася ў журналах. У адрозненне ад рымска-каталіцкай царквы ў праваслаўнай на пачатку XX ст. да спраў маглі далучацца кароткія прамовы мужа і жонкі. На апошнім этапе разгляду справы аб скасаванні шлюбу кансісторыямі рыхтаваліся праекты рашэнняў, якія перадаваліся на разгляд кіраўніка епархіі (дыяцэзіі). Пры гэтым калі ў каталіцкай царкве рашэнне, аформленае ўказам, прымалі біскуп і арцыбіскуп, то ў праваслаўнай царкве да 1832 г. канчатковае рашэнне заставалася за Сінодам, што запавольвала працэс. Пазней Сінод захаваў гэта права ў дачыненні да шлюбу асоб шляхецкага паходжання, а для прадстаўнікоў іншых саслоўяў застаўся апеляцыйнай інстанцыяй. Каталікі падавалі апеляцыі або ў Магілёўскую кансісторыю, якая з’яўлялася мітрапалітальнай, або з канца XIX ст. у іншую, спецыяльна вызначаную для гэтых мэт на тэрыторыі Расійскай імперыі. Муж і жонка знаёміліся з указам кансісторыі праз пасрэдніцтва органаў мясцовай улады. Пры гэтым да юрысдыкцыі духоўнага суда адносілася выключна прызнанне або незацвярджэнне скасавання шлюбу, маёмасныя скаргі вырашаліся свецкімі судовымі ўстановамі.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Толстой Д. А.* Римский католицизм в России. СПб. : Типография В. Ф. Демакова, 1876.
2. *Троицкий С. В.* Философия христианского брака. Киев : Фонд «Христианская жизнь», 1996.
3. *Антановіч З. В.* Асаблівасці скасавання шлюбу ў каталіцкай традыцыі XIX ст. // Беларус. гіст. часоп. 2008. № 4. С. 33–39.
4. *Антановіч З. В.* Архівы Магілёўскай і Мінскай рымска-каталіцкіх кансісторый: гісторыя, структура, склад дакументаў (1782–1918 гг.). Мінск : Экоперспектива, 2016.
5. *Majdański K.* Wspólnota życia i miłości: Zarys teologii małżeństwa i rodziny. Warszawa : Pallottinum, 1983.
6. *Мухина З. З.* Разводы в русской крестьянской семье в пореформенной России: гендерный аспект // Вестн. Рос. ун-та дружбы народов. Сер.: История России. 2013. № 1. С. 49–62.
7. *Белякова Е. В.* Бракоразводные дела в архиве Святейшего Синода // Архивы Русской православной церкви: пути из прошлого в настоящее. М., 2005. С. 328–336.
8. *Boudou A.* Stolica Swięta a Rosja: dyplomatyczne stosunki między niemi w XIX stuleciu : w 2 t. Kraków : Wydawhictwo Księży Jezuitów, 1928. Т. 1 : 1814–1847.

## References

1. Tolstoj D. [Roman Catholicism in Russia]. Saint Petersburg : Typografiya by V. F. Demakov, 1876 (in Russ.).
2. Troickij S. [Philosophy of christian marriage]. Kiev : Fond «Khristianskaya zhizn'», 1996 (in Russ.).
3. Antonovich Z. [Features of the dissolution of marriage in the Catholic tradition of the XIX century]. *Belarus. gistarychny chasopis.* 2008. No. 4. P. 33–39 (in Belarus.).
4. Antonovich Z. [Mohilev' and Minsk' Roman-Catholic consistories' archives: history, structure, content of documents (1782–1918)]. Minsk : Ekoperspektiva, 2016 (in Belarus.).
5. Majdan'ski K. [The unity of life and love: an essay on the theology of marriage and family]. Warszaw : Pollotinum, 1983 (in Pol.).
6. Mukhina Z. [Divorces in the Russian peasant family: traditions and the realities of post-reform period]. *Bull. of Peoples' Friendship Univ. of Russia. Ser.: Russ. hist. period.* 2013. No. 1. P. 49–62 (in Russ.)
7. Belyakova E. [Divorce in the archives of the Holy Synod]. In: *Arkhivy Russkoi pravoslavnoi tserkvi: puti iz proshlogo v nastoyashchee* [Russian Orthodox Church' archives: ways from past to present]. Moscow, 2005. P. 328–336 (in Russ.).
8. Boudou A. [The Holy See and Russia: diplomatic relations between them in the XIX century]. Crakow : Wydawhictwo Księży Jezuitów, 1928. Vol. 1: 1814–1847. (in Pol.).

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 20.09.2017.*
*Received by editorial board 20.09.2017.*